20 год Гродзенскай дыяцэзіі (42)

Аўтар: Рэдакцыя
27.01.2013 01:00



2012 год

22 студзеня - У Іўі адбыўся IX Фестываль калядак “Gloria in excelsis Deo”.

24 студзеня - У гродзенскай катэдры адбылося галоўнае экуменічнае набажэнства ў дыяцэзіі.

3 – 5 лютага - Гродна наведаў Апостальскі нунцый кс. абп Глаўдыа Гуджэроці. Ксёндз арцыбіскуп наведаў гродзенскія парафіі, сустрэўся з алюмнамі, выклад-чыкамі і журналістамі. На заканчэнне візіту ксёндз арцыбіскуп узначаліў урачыстую св. Імшу ў катэдры. † 14 лютага - Семінарыйны гурт “AVE” наведаў з канцэртам Навагрудак.

4 сакавіка - Рэдакцыя газеты “Слова Жыцця” адзначала 15-годдзе свайго існавання.

31 сакавіка - Адбылося набажэнства Крыжовага шляху вуліцамі Гродна.

28 – 30 красавіка - У парафіі св. Сям’і ў Лідзе адбыліся Дні моладзі пад дэвізам “Радуйцеся заўсёды ў Пану”. На ўрачыстасцях прысутнічаў Апостальскі нунцый.

29 красавіка – 6 мая - У Вярэйках адбыліся парафіяльныя місіі.

4 мая - У Лідзе адбылося асвячэнне помніка – знака-сімвала хрысціянскай еднасці. На ўрачыстай цырымоніі прысутнічаў кс. бп Аляксандр Кашкевіч.

6 мая - Падчас урачыстасцей у санктуарыі ў Капцёўцы кс. абп Клаўдыа Гуджэроці абвясціў рашэнне Святога Айца, які назначыў кс. Юзафа Станеўскага і кс. Лешэка Дамагалу ганаровымі капеланамі Святога Айца.

18 мая - У Адамавічах была адпраўлена св. Імша з нагоды 25-годдзя смерці кс. пробашча Казіміра Арлоўскага.

26 мая - 4 выпускнікі Гродзенскай ВДС атрымалі святарскія пасвячэнні з рук кс. б-па Аляксандра. Гэта былі: кс. Ян Раманоўскі, кс. Валерый Спірыдон, кс. Генрык Яблоньскі і кс. Віталій Бяленік.

31 мая - У гродзенскай катэдры пад кіраўніцтвам кс. б-па Аляксандра Кашкевіча была адпраўлена св. Імша з нагоды сярэбраных і залатога юбілеяў святарскіх пасвячэнняў ксяндзоў, якія працуюць у нашай дыяцэзіі. Ксяндзы юбіляры: кс. Аляксандр Шэмет, а. Станіслаў Садоўскі, кс. Генрык Яблоньскі, кс. Тадэвуш Крыштопік, кс. Мар’ян Хаменя і а. Леон Вітэк.

1 чэрвеня - Адбыўся II Дыяцэзіяльны дзень дзіцяці.

3 чэрвеня - У Пелясе памёр кс. пробашч Пётр Крыкшчукайціс.